# III. ПРОБЛЕМА ТРАДИЦИЙ И НОВАТОРСТВА В ЛИТЕРАТУРЕ

**А.І. Белая**
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: alba.57@mail.ru

УДК 821.161.3–3(043)“20”

## ТЫПЫ КРАЎЦА, ДОКТАРА І ЛЕТАПІСЦА: СІСТЭМНЫЯ СУВЯЗІ І АДНОСІНЫ ПЕРАЕМНАСЦІ (на матэрыяле прозы 1-й трэці ХХ стагоддзя)

*Ключавыя словы: тыпізацыя, канцэпцыя асобы, дыялектычныя сувязі, тыпалагічныя разнавіднасці, духоўная сутнасць.*

*У артыкуле разглядаецца мастацкі тып краўца як «сведкі» і суб’екта гісторыі, носьбіта гуманістычнай псіхалогіі, у яго сувязях з традыцыйнай асобай летапісца, рэфлексіўнай і неабыякавай да лёсу чалавека і грамадства; асэнсоўваецца метафорыка і пераемнасць вобразаў цырульніка і хірурга; акрэсліваецца творчы патэнцыял «незавершанай асобы» ардынатара як адметнай іпастасі аб’ектыўнага летапісца антыгуманнай эпохі.*

Нацыянальнае мастацтва толькі тады з’яўляецца каштоўным, калі спалучае веданне сусветнай культуры са зваротам да народных традыцый і характэрных вобразаў. Пры разнастайнасці разумення паняцця «характар» тыпізацыя і звязаная з ёй індывідуалізацыя адлюстраваных асоб — прынцып мастацкай творчасці, які яднае пісьменнікаў розных часоў і народаў. Паміж многімі персанажамі розных аўтараў прама або ўскосна прасочваюцца ўнутраныя сувязі, выяўляюцца агульныя вытокі і эвалюцыйныя тэндэнцыі, назіраецца падабенства асноўных мастацкіх задач і рашэнняў. Звычайна аўтар выстройвае ланцуг падзей, кіруючыся пэўнай іерархіяй характараў у залежнасці ад абранай тэмы. Галоўныя героі твораў, праз вобразы якіх раскрываецца аўтарская канцэпцыя, пераважна займаюць цэнтральнае месца і ў сюжэце, а іх уласныя імёны часта ўказваюць на праблемы і каштоўнасці пэўнага гістарычнага перыяду. Аднак у літаратуры 1-й трэці ХХ стагоддзя так адбываецца не заўсёды. Большасць літаратурных асоб у беларускай прозе гэтага часу уяўляюць сабой семантыка-стылявыя мадыфікацыі традыцыйнага вобраза «маленькага чалавека», але маюць яскравую нацыянальную адметнасць. Культурную велічыню «малога» чалавека ўвасабляе рамеснік. З.Бядуля адзначаў, што кавалі, шаўцы, краўцы былі людзьмі першай важнасці і пашаны ў вёсках. Да іх прыходзілі не толькі «па справах іх спецыяльнасці», але так сабе: параіцца, «пагутарыць з разумнымі людзьмі» і г. д. [2]. Рамеснік, заўважае К. Чорны, «мае да самае магілы свае талент у руках». Шавец ці кравец «...сабе заўсёды сядзіць і калупаецца патроху» [13, с.389]. Краўцу ў літаратуры належыць асаблівае месца. Яго шчуплая постаць — камічны аб’ект еўрапейскага фальклору. Але ў гэтым вобразе няма сатыры на прафесію: камізм дасягаецца кантрастам нягеглаcці краўца з яго кемлівасцю і дасціпнасцю. Якраз такі Лейзар у М.Мойхер-Сфорыма, «кравец з ног да галавы»: «маленькі, лядашчы, з бледным тварыкам, вельмі спрытны, рухавы, як ртуць, з усімі кравецкімі звычкамі...» [7, с.37]. У. Проп дакладны ў думцы, што «праца, якая ўключае хаця б нязначную долю творчасці, не можа быць сама па сабе паказана камічнай» [12 с.59]. Аляксандра («Краўцы і чаляднікі» Л. Калюгі) шые добра, моцна і мае адмысловы прафесійны кодэкс. Ён не церпіць недаверу, не спяшаецца адкрываць чаляднiку сакрэты майстэрства, каб той «у яго куска хлеба не адабраў...» [6, с.301]. Акрамя таго, у творы ўвасоблены спрадвечныя жыццёвыя прынцыпы: не толькі «ўсё ўмець, ды не ўсё рабіць», але і «ўмельства за плячыма не насіць»; «што зроблена, усё пойдзе на карысць». Праз жыццёвыя перыпетыі сваіх «малых» у сацыяльным маштабе герояў Л.Калюга праводзіць думку: не ваяўнічы народ беларусы; іхні шлях праца, а не вайна — і ўсяляк ратуе сваіх краўцоў і чаляднікаў ад удзелу ў забойстве і рызыкі загінуць. Кравец з рамана К.Чорнага «Трэцяе пакаленне», як піша М. Тычына, «абраў сабе прафесію і спосаб жыцця, якія давалі яму хоць невялікую магчымасць быць гаспадаром уласнага лёсу» [5, с.357]. Даследчык ужывае онім Кравец як імя ўласнае, бо па сваім маштабе створаны К. Чорным характар можа прэтэндаваць на ролю звыштыпа: ён увасабляе асновы нацыянальнага характару беларусаў. Варта адзначыць, што адсутнасць уласных імёнаў або знешняя безаблічнасць персанажаў мастацкай літаратуры часта ацэньваюцца як вынік недапраяўленасці духоўнай сутнасці асобы. Але ў прозе «эпохі рубяжа» безыменнасць служыць і прыхоўванню гэтай сутнасці.

Вобраз краўца, які хадзіў «па людзях», збліжаецца з вобразам летапісца як рэфлексіўнай асобы, неабыякавай да лёсу чалавека і свету. Як адзначае Ю.Лотман , рэальнасць летапісу ўвасабляла

ідэал гісторыі і паводзін людзей, а ўведзеная ў яго тэкст простая мова з'яўлялася сведчаннем нявыдуманага. Таму сам факт такой пабудовы аповеду ўжо ўспрымаецца як доказ праўдзівасці. Мастацкі тып летапісца, сведкі гісторыі, абагульняе гістарычны вопыт, выяўляе народную думку, прапаведуе вечныя каштоўнасці. Нездарма ён уводзіцца ў эпічнае дзеянне і нават робіцца галоўным (загаловачным) героем, як нястомны вандроўнік Якаў Кампінскі, «прыватны назіральнік жыцця, сціплы сведка гісторыі» ў аднайменным рамане расійскага пісьменніка-эмігранта М.Асаргіна. «Кіпіць Расія — і айцец Якаў стаіць ля катла са сваёй лыжкай... калі магчыма, ціхенька і неўтрапёна зачэрпне варыва» [10], каб змясціць усё ў сваіх мемуарах, і не дзеля забаўкі, а дзеля нашчадкаў. Роля летапісцаў асабліва значная ў часы, калі «няма выразнай свядомасці для дзеяння», калі трэба «...у новых умовах пачаць пакрысе здагадвацца пра значэнне мінулага… у сучасным з мінулага здагадвацца пра будучае» [11, с.152]. У інтэрпрэтацыі ўдзельніка, відавочцы, сведкі раскрываюцца сэнс і роля моманту, падзеі, выпадку. Эстэтыка-філасофская вартасць асобы краўца бачыцца ў тым, што, па сутнасці, ён адзіны ў рамане, чый вобраз не пацярпеў часавай дэфармацыі. Да стварэння падобнага мастацкага тыпу паступова набліжаўся З.Бядуля. Калі ў апавяданні «Летапісцы» пафас вобраза ўнука камічны, дзеда — трагікамічны, а «летапіс» засяроджаны на падзеях прыватнага жыцця, то «Леў Талстой» у рамане «Язэп Крушынскі» па вялікім рахунку працягвае традыцыю назірання і фіксацыі гісторыі ў аспекце высокага гуманізму. Асабовая маральная пазіцыя і ацэнка падзей — паказчык духоўнага росту «маленькага чалавека», што не так і мала ў часы безладу.

Рамяство спрадвеку давала беларусу, як любіў выказацца К.Чорны, «спосаб да жыцця». Але кравец яго страчвае. Пэўна, вульгарызатарская крытыка не засяродзілася на наступнай рэпліцы ў праспектыўным маўленні героя: «Сказаць праўду — рамяство маё цяпер на заняпад пайшло. Можа, *пасля* там, а *цяпер* — калгасы, знаеце (курсіў наш — ***А.Б.***)» [14, с.155]. І ён суцяшае сябе: каля Дзвюх Хат «фабрыка такая людзям адкрылася, зарабляць можна. Няма кажуха шыць, то ёсць зямлю капаць або, можа, і лягчэйшае што» [14, с.142]. У гэтай нібыта пабытавай калізіі бачыцца канфлікт культуры і цывілізацыі. К. Чорны нездарма ставіць побач дзве прафесіі — шыць кажухі і капаць зямлю. Ён супрацьпастаўляе творчую і руцінную, прымусовую працу. Як адзначаў у 1922 годзе А.Швейцэр, дасягненні навукі і тэхнікі дазваляюць працаўніку выкарыстоўваць толькі частку здольнасцей, што падрывае веру ў духоўную значнасць працы, збядняе духоўную сутнасць асобы. Вузкая спецыялізацыя не патрабуе кемлівасці і ўмельства, заглушае творчы і мастацкі пачаткі. Навучыцца мураваць сцены лягчэй, «чым авалодаць нават самымі пачаткамі культуры» [4, с.293], — пісаў П.Галавач. З пачатку працы на будаўніцтве кравец сячэ кусты, а потым робіцца мулярам. Але гэтая «чорнарабочая справа» хутка яму апрыкрала, тым больш што ён валодае і іншымі відамі рамяства, у тым ліку ўмее «...у ганчарні гаршкі круціць» [14, с.79]. Уменне працаваць з глінай, матэрыялам першастварэння, выяўляе краўца як творчую асобу (такі ж муляр-мастак Лапко ў «Адшчапенцы» Я.Коласа). Краўцом быў і малады Яська Русеччык («Пустадомкі» Л.Калюгі). Аўтар дадае сціслы, але важны штрых да яго характарыстыкі: «І паўсвету знаў праз гэта» [6, с.407]. Брадзячымі, па словах К.Чорнага, рамеснікамі былі не толькі краўцы, а і стальмахі, і страхары. Цяўлоўскі — добры страхар, «пярвушчы майстар» [6, с.167]. Яго жыццёвы кантэкст — дарога, праца, людзі. Чаго ні ўбачыш, ні наслухаешся, «ні дадумаешся салгаць, з стрыхоўкаю круга свету абыходзячы, назіраючы жыццё розных станаў з вышыні стрэх?» [6, с.167].

Традыцыйны сацыяльны характар краўца ў «эпоху рубяжа» набывае разнабаковае канкрэтна-гістарычнае і эстэтыка-філасофскае напаўненне. У часы, калі, па словах М. Лынькова, пачалі свет кроіць ды перакройваць, семантыка слова «кравец» пашыраецца за кошт шматлікіх канатацый. Як пісаў у паэме «Калі асядае муць» Т.Кляшторны, «Мы кроім вопратку чужым / І трапна, брат, не заўсягды, часцей выходзіць па-дурному» [цыт па: 1, с.907]. У 1937 і 1938 гадах адпаведна рускі паэт Л.Мартынаў стварае паэмы «Табольскі летапісец» і «Нюрнбергскі кравец». Канцэпцыя загалоўкавых герояў робіць іх узаемапранікальнымі вобразамі-папярэджаннямі аб умацаванні таталітарных тэндэнцый. Вобразы краўца і чаляднiка як пасіянарных асоб, носьбітаў гуманістычнай псіхалогіі, сведкаў, суб'ектаў і ахвяр гісторыі, аўтар трансфармуе ў святле падзей, звязаных з запанаваннем фашысцкай ідэалогіі ў Еўропе.

Тыпалогія літаратурных характараў па прафесійнай прыналежнасці не зводзіцца толькі да іх сацыяльнай ідэнтыфікацыі, яна мае і сімвалічны сэнс. У хрысціянстве Бог, які апякуецца людзьмі, параўноўваецца з умелым урачом: усякай чалавечай немачы ён прызначае адмысловае лячэнне. М.Валошыну належыць паэтычны заклік да творцаў: «В дни революции быть Человеком, а не гражданином: / Помнить, что знамёна, партии и программы / То же, что скорбный лист для врача сумасшедшего дома» [3, с.158].У шэрагу твораў рускай літаратуры (Я.Замяціна, М.Булгакава, А.Бяляева) ідзе гаворка «пра пошук найкарацейшага шляху да змянення чалавечай прыроды. Такім шляхам эпосе ўяўляецца шлях хірургічны» [7, с.97]. «Утрапёным хірургам» назваў М.Валошын Пятра Першага. Але, як напісаў яшчэ М.Мантэнь, усе буйныя перамены расхістваюць дзяржаву і ўносяць у яе сумятню. «Таму, хто жадае вылечыць яе адным махам, не шкодзіла б задумацца, што з гэтага выйдзе…» [9, с.205]. У прозе «эпохі рубяжа» вобраз доктара абумоўлены матывамі хваробы і вар'яцтва як

метафарычнымі станамі героя крызіснага часу. Падобны матыў праводзіць К.Чорны ў рамане «Сястра», дзе Казімер Ірмалевіч удасканальваецца як хірург, а былы камісар Абрам Ватасон па волі аўтара набывае прафесію цырульніка. У сярэднявеччы лазеншчыкі (цырульнікі) складалі асаблівы цэх і мелі права займацца малой хірургіяй. Галоўная іх дзейнасць заключалася ў кровапусканнях, якія ў той час былі надзвычай распаўсюджаны. На працягу многіх стагоддзяў не існавала іншага шляху для вывучэння хірургіі, як толькі праз цырульні. 1930-я гады — маральнае сярэднявечча XX стагоддзя. Мадэлюючы хранатоп рамана, К.Чорны ўводзіць вобраз лазеншчыка Радзівона Цівунчыка, які кантрастуе з вобразам цырульніка сваім гуманістычным зместам.

Паміж тыпамі доктара і летапісца Л.Калюга змяшчае свайго героя Зэнку («Утрапенне»), рэдактара насценнай газеты, які старанна фіксуе падзеі і перамены ў жыцці і грамадскіх настроях. Калі пачаліся раскулачванні, некаторыя «нават... хадзілі ў камісіі. А Зэнка заставаўся спакойны і ўважлівы. Гэтакі бывае ў бальніцы ардынатар, калі з прафесарам абыходзяць палату. Яму каб усё бачыць і нічога не прапусціць. Бяда, што далей развіць гэта параўнанне нельга. Хто ж тады як прафесар будзе? Пярун Рыжы? А чым ён не падыдзе? Усім. Таму Зэнка не ў камісіі, а толькі дзеля тэм быў» [6, с.519]. Пярун Рыжы — старшыня сельсавета, прыхільнік радыкальных мер калектывізацыі. Яго можна лічыць гіпатэтычна маркіраванай асобай, што ўвасабляе, як і Пацяроб у рамане М.Зарэцкага «Вязьмо», «страшнага калектывізатара» ўсесаюзнага маштабу. Канцэпцыя асобы «бесстаронняга ардынатара» збліжаецца з канцэпцыяй асобы летапісца. Каб нейтралізаваць адмоўны пафас асобы Перуна, Л.Калюга ставіць побач з ім Зэнку, у якім азначаны рысы творчай і нацыянальна свядомай асобы. Калі б пісьменнік змог закончыць твор, Зэнка, хутчэй за ўсё, рэалізаваўся б у межах сюжэту як пісьменнік ці паэт, які, падобна летапісцу, кіруецца ў сваёй творчасці традыцыяй, ісцінай і мараллю (падобны намер выказвае паэтаграном Ягупла ў рамане П.Галавача «Праз гады»).

Такім чынам, праведзенае даследаванне выявіла сувязі як унутры персанажаў аднаго тыпу ў межах розных хранатопаў, так і паміж адрознымі тыпамі, што звязана з асаблівасцямі эпохі, зменамі ў свядомасці аўтараў, пошукамі ў галіне мастацкай формы. Беларускія пісьменнікі ў канцэптуальным паказе «маленькага чалавека» ідуць ад прыватнага, побытавага да ўніверсальнага, быццёвага. У персанажах новага часу ў той або іншай мастацкай форме ўвасоблены рысы традыцыйных літаратурных асоб.

**Літаратура**


1. Адамовіч, Ант. Да гісторыі беларускае літаратуры / Ант. Адамовіч. — Мінск : Выдавец ІП Зміцер Колас, 2005. — 1464 с.
2. Бядуля, З. Жыды на Беларусі / З.Бядуля [Электронны рэсурс]. — Режим доступа: http://knihi.com/Zmitrok_Biadula/Zydy_na_Bielarusi_Bytavyja_strychi.html/ — Дата доступа: 03.12.2016Волошин, М. Избранное: Стихотворения, воспоминания, переписка / Сост., подгот. текста, вступ. ст. и коммент. З.Давыдова, В.Купченко. // М. Волошин. — Мінск : Маст. літ., 1993. — 479 с.
3. Галавач, П. Праз гады / П. Галавач. — Мінск : Маст. літ., 1984. — 368 с.
4. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. — Мінск : Бел. навука, 1999. — Т 2. 1921—1941. — 903 с.
5. Калюга, Л. Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты / Уклад., прадм. Я. Лецкі; Камент. Н.В. Гаўрош, Т. М. Трыпуцінай /Л. Калюга. — Мінск : Маст. літ., 1992. — 607 с.
6. Куляпин, А.И., Скубач, О.А. Мифология советской повседневности в литературе и культуре сталинской эпохи: монография / А. И. Куляпин, О.А.Скубач. // Отв. ред. И.В. Силантьев. — М. : Языки славянской культуры, 2013. — 240 с. — (Коммуникативные стратегии культуры).
7. Мойхер-Сфорим, М. Маленький человечек / М. Мойхер-Сфорим. — СПб. :Северо-Запад Пресс, 2003. — 510 с.
8. Монтень, М.Опыты. Избр.произв.: в 3 т. / М. Монтень. Пер. с фр. — М. : Голос, 1992. — Т.3 — 416 с.
9. Осоргин, М. А. Свидетель истории / М. Осоргин. — [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http: www // lib. ru / RUSSLIT / OSORGIN / svidetel. txt / — Дата доступа: 14.08.09
10. Пришвин, М.М. Дневники. / М. Пришвин. // Сост., предисл. и комм. Ю. А. Козловского. — М. : Правда, 1990. — 480 с.
11. Пропп, В.Я. Проблемы комизма и смеха / В.Я. Пропп. — М. : Лабиринт, 2002. — 192 с.
12. Чорны, К. Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1973. — Т. 3 : Раманы. –– 544 с.
13. Чорны, К. Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. — Мінск : Маст. літ., 1974. — Т. 5: Раман, дзве аповесці. — 446 с.



**A.I. Belaya**
Baranovichi State University
alba.57@mail.ru


## Types of tailor, doctor and chronicler: the system contacts and the relationship of succession (based on the prose of the 1st third of the twentieth century)


*Key words: typification, personality concept,* dialectical relationship, typological variations, *inner essence.*



*The article discusses the artistic type of a tailor as "witness" and subject of history, medium of humanistic psychology. The type is described in its relation to the traditional image of a chronicler who has reflective facilities and is not indifferent to the fate of society. Metaphorical meanings and successive relationship of images "barber" and "surgeon" are also interpreted. The specific attention is paid to the "unfinished personality" of an intern as the artistic manifestation of objective chronicler who deals with inhuman epoch.*


Рэпазіторый БарДУ